# Гісторыя

В. І. МЕНЬКОЎСКІ

## ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ — 60 ГОД

У кастрычніку гістарычнаму факультэту Беларускага дзяржаўнага універсітэта споўнілася 60 гадоў. Гісторыя факультэта — значная з'ява не толькі беларускай навукі, але і гісторыі Беларусі: сапраўдная плеяда выдатных навукоўцаў, грамадскіх і палітычных дзеячаў падрыхтавана ў сценах гістфака. Нашы дыпломы атрымалі тысячы спецыялістаў, працуючых у школах, у культурна-асветніцкіх і навуковых арганізацыях, архівах, музеях, вышэйшых навучальных установах.

Першы набор студэнтаў на гістарычны факультэт налічваў усяго 67 чалавек. Вучэбныя дысцыпліны выкладалі два акадэмікі, тры прафесары, чатыры дацэнты і шэсць аспірантаў. У склад факультэта ўваходзілі кафедры гісторыі СССР і БССР, гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, новай і навейшай гісторыі. Дэканам факультэта быў прызначаны акадэмік В. К. Шчарбакоў.

Да часу адкрыцця самастойнага факультэта ў выкладанні гісторыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ўжо былі назапашаны пэўныя традыцыі. З 1921 г. ажыццяўлялася падрыхтоўка гісторыкаў на факультэце грамадскіх навук, а з 1922 г. — на педагагічным факультэце. Знамянальна, што вучэбныя заняткі ў БДУ былі пачаты лекцыяй па сусветнай гісторыі, прачытанай 30 кастрычніка 1921 г. прафесарам Д. П. Канчалоўскім.

Асаблівая роля ў станаўленні сістэмы падрыхтоўкі кадраў гісторыкаў належыць першаму рэктару БДУ акадэміку У. І. Пічэту. Выдатны вучоны быў і відным арганізатарам навукі. Яму ўдалося прыцягнуць да працы ва ўніверсітэце вядомых гісторыкаў: У. М. Ігнатоўскага, У. М. Перцава, Ф. Ф. Турука, А. А. Савіча і інш. У перыяд станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі не хапала ўласных гістарычных кадраў, таму запрашаліся навукоўцы, выкладчыкі з-за межаў Беларусі, у першую чаргу — з Расіі.

Паступова складвалася ўласная беларуская школа. М. М. Нікольскі, М. В. Доўнар-Запольскі, У. М. Перцаў, У. І. Пічэта падрыхтавалі дастойных пераемнікаў. У 20—30-я гг. пачалі педагагічную і навуковую дзейнасць І. Ф. Лочмель, А. П. П'янкоў, Д. А. Дудкоў, К. І. Кернажыцкі.

У гэты перыяд беларускім гісторыкам даводзілася працаваць у вельмі складаных і супярэчлівых умовах. Беларусь адной з першых рэспублік СССР увяла ўсеагульную пачатковую адукацыю, пашыралася сетка сярэдніх школ і ВНУ. Ва ўсіх абласных цэнтрах былі адкрыты інстытуты ўдасканалення настаўнікаў і педагагічныя інстытуты. Усё гэта патрабавала пашырэння падрыхтоўкі кадраў інтэлігенцыі, у тым ліку і гісторыкаў. Але для дзяржаўнага ідэалагічнага апарату галоўным было не развіццё гуманістычных каштоўнасцей, а прапаганда класавых прынцыпаў, падпарадкаванне навукі так званым «дзяржаўным інтарэсам».

Нацыянальная культура ўціскалася. У канцы 20-х гг. абвастрылася барацьба з ідэалогіяй нацыянал-дэмакратызму, якая вызначалася як варожая Савецкай уладзе контррэвалюцыйная плынь. Інтэлігенцыя рэспублікі панесла значныя страты: многія навукоўцы, пісьменнікі, дзеячы мастацтва паплаціліся жыццём за вернасць ідэям нацыянальнага адраджэння. Але нават у такіх цяжкіх умовах самаадданыя навукоўцы знаходзілі сілы адстойваць гонар чалавека і навукі, даводзіць да студэнтаў аб'ектыўна пацверджаныя навуковыя погляды на гістарычны працэс, на месца нашай Айчыны ў сусветнай гісторыі.

Да 1941 г. на гістарычным факультэце было падрыхтавана каля 200 спецыялістаў-гісторыкаў. У цяжкіх умовах пачатку Вялікай Айчыннай вайны і акупацыі Беларусі патрабаваліся прыкласці значныя намаганні па ўзнаўленню навучальнага працэсу ва эвакуіраваным універсітэце. У кастрычніку 1943 г. на станцыі

Сходня пад Масквой пачаліся заняткі. У ліку шасці факультэтаў, што адчынілі дзверы для студэнтаў, быў і гістарычны.

Усе пасляваенныя гады гістарычны факультэт працягваў заставацца буйнешым у рэспубліцы цэнтрам падрыхтоўкі педагагічных і навуковых кадраў. У 50—70-я гг. значны асабісты ўплыў на развіццё гістарычнай навукі ўнеслі выкладчыкі факультэта Л. С. Абецэдарскі, М. П. Баранава, Г. М. Ліўшыц, Я. П. Навуменка, Ф. М. Нячай, Л. М. Палетыка, П. З. Савачкін, Р. М. Трухноў, Л. М. Шнеерсон.

Зразумела, што ва ўмовах аўтарытарнага аднапартыйнага рэжыму «ідэалагічны факультэт», яго супрацоўнікі і выхаванцы былі вымушаны прытрымлівацца дэкрэтаванага зверху класавага падыходу да ацэнкі гістарычных падзей.

Тым не менш нельга ацэньваць гэтыя гады проста як «застой» у навуцы. Факультэт павялічваў прыём студэнтаў, уводзіў новыя спецыяльнасці, апрабоўваліся розныя методыкі навучання, пашыраліся міжрэспубліканскія і міжнародныя сувязі. І самае галоўнае — факультэт рыхтаваў кадры кваліфікаваных вучоных і выкладчыкаў. Калі склаліся спрыяльныя ўмовы і яны атрымалі магчымасць рэалізаваць назапашаны патэнцыял, стала відавочным, што ў рэспубліцы існуе сапраўдная своеасаблівая гістарычная школа. Беларускія гісторыкі аказаліся ў стане ствараць і адстойваць уласную канцэпцыю развіцця Айчыны, аказваць дзейсны ўплыў на фарміраванне грамадскіх працэсаў сённяшняга дня.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, палітычныя і эканамічныя рэформы стварылі ўмовы для беларускага сацыяльнага і культурнага адраджэння. Дзяржаўны суверэнітэт Беларусі сцвярджаўся ў імя высокай мэты — свабоднага развіцця і павышэння дабрабыту кожнага грамадзяніна рэспублікі. Дзякуючы дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый аднаўляюцца нацыянальна-культурныя каштоўнасці, праўда аб гістарычным мінулым, вяртаюцца забытыя імёны.

У перыяд станаўлення нацыянальнай самасвядомасці гістарычная навука павінна адпавядаць асабліва высокім стандартам. Зараз на гістарычным факультэце працуе дзевяць кафедраў: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу; гісторыі старажытнага свету і сярэдневякоўя; гісторыі новага і навейшага часу; археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; расійскай і славянскай гісторыі; навейшай гісторыі славянскіх краін; крыніцазнаўства і музеязнаўства; міжнародных адносін. Супрацоўнікі факультэта вядуць плённую даследніцкую працу, падрыхтавалі новыя падручнікі, вучэбныя дапаможнікі для ВНУ і школ, метадычныя распрацоўкі па ўсіх гістарычных дысцыплінах; больш 20 праграм па вучэбных дысцыплінах рэкамендаваны для зацвярджэння ў якасці тыповых для вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

Гістфак падтрымлівае шырокія сувязі з многімі навуковымі цэнтрамі замежжа. Выкладчыкі і супрацоўнікі актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных кангрэсах, сустрэчах, сімпозіумах. Студэнты факультэта ўдзельнічаюць у выкананні разнастайных навуковых прац, уваходзяць у склад археалагічных экспедыцый, выступаюць з дакладамі на канферэнцыях. На аддзяленнях гісторыі, архівазнаўства, музеязнаўства і міжнародных адносін сёння займаецца больш за 1200 студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання. Заняткі вядуць 75 выкладчыкаў, сярод якіх 15 прафесараў і дактароў навук і 50 дацэнтаў. Вялікі ўклад у стварэнне структуры сучаснага факультэта ўнеслі дэканы П. З. Савачкін, І. О. Царук, Э. М. Загарульскі, П. А. Шупляк; загадчыкі кафедраў І. В. Аржахоўскі, А. П. Ігнаценка, У. С. Кошалеў, А. П. Салькоў, У. Н. Сідарцоў, В. А. Фядосік, А. В. Шарапа.

У мэтах задавальнення патрэбы рэспублікі факультэт стаў рыхтаваць кадры па трох новых спецыяльнасцях: архівазнаўства, музеязнаўства і міжнародныя адносіны. У хуткім часе мяркуецца стварыць яшчэ аддзяленне, на якім будуць рыхтавацца такія новыя спецыяльнасці, як археалогія і этнаграфія. З 1993 г. на гістарычным факультэце ажыццяўляецца падрыхтоўка па новай спецыялізацыі «рэлігія ў гісторыі чалавецтва».

Асноўныя напрамкі канцэпцыі выкладання гісторыі накіраваны на прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, аб'ектыўных падыходаў да аналізу і асвятлення гістарычнага працэсу. Галоўнае месца ў навучальным працэсе факультэта, натуральна, займае цыкл дысцыплін па гісторыі і культуры Беларусі. Гэта такія курсы, як «Гісторыя Беларусі», «Археалогія Беларусі», «Гісторыяграфія Беларусі», «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі», «Этнаграфія Беларусі» і іншыя. Выкладчыкі факультэта чытаюць лекцыйныя курсы па гісторыі Беларусі на іншых падраздзяленнях універсітэта, у розных навучальных установах.

Пры вывучэнні агульнай гісторыі асаблівае месца належыць гісторыі суседніх народаў — рускага, украінскага, польскага і літоўскага, з якімі беларусаў звязвае многае як у мінулым, так і сёння. У сувязі з тым, што гісторыя СССР і Расіі зараз стала разглядвацца як частка ўсеагульнай гісторыі, патрабавалася ўнесці змяненні ў арганізацыю навучальнага працэсу, стварыць новыя кафедры.

Задача фарміравання ўласнага погляду на гісторыю, выпрацоўкі канцэпцыі і падрыхтоўкі кадраў беларускіх гісторыкаў вельмі складаная. Тым больш, што вышэйшая школа рэспублікі знаходзіцца ў цяжкім становішчы: не хапае падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у занядбаным выглядзе знаходзяцца архівы

Рэспублікі Беларусь, па многіх гістарычных пытаннях неабходны цесныя і рэгулярныя навуковыя кантакты з «бліжэйшым і далёкім» замежжам. Сапраўды жабрацкім можна назваць матэрыяльнае становішча вышэйшай школы. Усё гэта вельмі трывожыць. Але ёсць галоўнае, што дазваляе захоўваць надзею, гэта — магчымасць мець уласны пункт гледжання, свабода навуковых дыскусій, адсутнасць дагматызму і навязанага зверху афіцыйнага пункту гледжання. Беларускі народ атрымаў гістарычны шанц для свабоднага развіцця. Яго немагчыма здзейсніць без дасканалага ведання свайго мінулага, без аб'ектыўнай адзнакі ролі і месца Беларусі ў міжнародным супольніцтве і сусветным гістарычным працэсе.

А. Г. БАГДАНОВІЧ

## ІДЭЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАГРАМАХ ЛІБЕРАЛЬНА-БУРЖУАЗНЫХ ПАРТЫЙ БЕЛАРУСІ (сакавік — кастрычнік 1917 г.)

Па насычанасці падзеямі 1917 г. займае асобае месца ў гісторыі барацьбы беларускага народа за нацыянальнае вызваленне, палітычную і эканамічную незалежнасць. Менавіта ў гэты час на першы план выходзіць пытанне дзяржаўнага самавызначэння беларускай нацыі, больш акрэслены выгляд набываюць уяўленні аб формах і змесце дзяржаўнасці, шляху яе дасягнення.

Палітычная атмасфера ў Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі была яшчэ больш заблытанай, чым у Расіі. Тут перапляліся ўлада Саветаў з уладамі камісараў Часовага ўрада і камітэтаў грамадскай бяспекі, што, акрамя таго, ускладнялася нямецкай акупацыяй, знаходжаннем у Магілёве стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага і барацьбой розных палітычных сіл. Справе нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння перашкаджалі таксама нізкі стан самасвядомасці беларускага насельніцтва, ігнараванне беларускага пытання з боку Расіі — Часовага ўраду і рэвалюцыйнай апазіцыі, якую ўвасабляла бальшавіцкая партыя.

Лютаўская рэвалюцыя ўнесла новы змест у беларускі рух, значна пашырыла яго сацыяльную базу. Тут, як і ва ўсіх нацыянальных рэгіёнах Расіі, пачаў складвацца памешчыцка-буржуазны блок. Грамадска-палітычныя арганізацыі гэтага блоку абаранялі інтарэсы розных пластоў беларускага грамадства, у першую чаргу — буржуазіі, часткова — памешчыкаў, заможнага сялянства, чыноўніцтва, праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Праграмы іх мелі ліберальны накірунак, асноўныя праграмныя палажэнні былі запазычаны галоўным чынам у кадэтаў.

Наогул, канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты) была адной з найбольш масавых і ўплывовых сярод дзесяткаў партый, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў сакавіку — кастрычніку 1917 г. Кадэты дамінавалі ў Часовым урадзе Расіі.

Асноўныя праграмныя палажэнні партыі былі прыняты на ўстаноўчым з'ездзе ў кастрычніку 1905 г. Канчаткова зацвердзіў праграму кадэтаў другі з'езд у студзені 1906 г. Змяненні ў праграму ўносіліся на VII і VIII з'ездах партыі ў сакавіку і маі 1917 г.

Як вядома, асаблівую вастрыню нацыянальныя праблемы набылі ў гады першай сусветнай вайны. Кадэты разумелі, што нацыянальная палітыка царызму садзейнічала ўзмацненню сепаратысцкіх тэндэнцый. Разам з тым яны не маглі не ўлічваць актывізацыі вызваленчых настрояў у нацыянальных рэгіёнах краіны. У той жа час кадэты павінны былі лічыцца з міжнароднымі абставінамі, пазіцыямі ваюючых дзяржаў, якія імкнуліся выкарыстоўваць у сваіх мэтах невырашанасць нацыянальнага пытання ў Расіі. Менавіта гэтыя абставіны аказалі свой уплыў на распрацоўку кадэтамі нацыянальнай праграмы ў 1917 г.

З першых дзён вайны кадэты лічылі неабходным «захаваць нашу краіну адзінай і непадзельнай»[1]. Робячы акцэнт на ўнітарны характар дзяржаўнага ладу Расіі, яны актыўна не прымалі заклікаў да палітычнага самавызначэння народаў, федэралізму, права на тэрытарыяльную аўтаномію.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі пазіцыі кадэтаў па нацыянальнаму пытанню, па сутнасці, не змяніліся. Аб гэтым сведчаць пастановы VIII партыйнага з'езда, які адбыўся ў маі 1917 г. На з'ездзе быў заслуханы і абмеркаваны даклад вядучага тэарэтыка партыі, маскоўскага прафесара дзяржаўнага права Ф. Ф. Какошкіна «Аб аўтаноміі і правах нацыянальнасцей», унесены змяненні ў адпаведныя раздзелы праграмы. Падкрэсліваючы сваю адданасць прынцыпу захавання «адзінай і непадзельнай Расіі», дакладчык і большасць дэлегатаў з'езда выказаліся супраць дазвалення народнасцям права як палітычнага самавызначэння, так і нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. На дадзеным гістарычным адрэзку, ва ўмовах палітычнай дэстабілізацыі і ўзмацнення канфрантацыі ў міжнацыянальных адносінах, на думку кадэтаў, падзел краіны па нацыянальна-тэрытарыяльнаму прынцыпу з лагічнай непазбежнасцю прывёў бы «да поўнага разбурэння дзяржаўнага адзінства Расіі і ўсталяванню не федэрацыі (саюзнай дзяржавы), а канфедэрацыі (саюза дзяржаў)»[2]. Аптымальным рашэннем нацыянальнага пытан-